выстаўкі

# Памяць аб вайне дзеля міру

Адна з найважнейшых дат 2020 года — свята 75-годдзя Вялікай Перамогі, да якога прымеркавана безліч выставак, прэзентацый, выданняў кніг і іншых культурных праектаў, накіраваных на тое, каб захаваць памяць аб подзвігах і ахвярах беларускага народа. Але не варта забываць і пра іншыя трагічныя падзеі, якія праходзілі праз нашу зямлю на працягу стагоддзяў яе існавання.

Маштабны выставачны праект «Вайна і мір. Беларусь памятае» накіраваны на стварэнне экспазіцый, якія паказваюць гісторыю краіны падчас войн і міжваенных гадоў у перыяд з 1812 па 1945 год. Стваральнікі праекта — Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, гісторык, калекцыянер, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» Уладзімір Ліхадзедаў.

Па задуме арганізатараў, Вялікая Перамога 1945 года сімвалізуе кропку ў гісторыі ваенных канфліктаў на тэрыторыі Беларусі. «Перамога стваралася не толькі з 1941-га па 1945 год — бацькі і дзяды герояў Вялікай Айчыннай вайны былі героямі Першай сусветнай, а іх дзяды і прадзеды — героямі вайны 1812 года. Гэты ланцужок, па якім перадавалася любоў да Радзімы, і будзе паказаны ў новым праекце», — адзначыў намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар Бузоўскі. Па яго словах, аўтары праекта шукалі новы спосаб адлюстроўвання тэмы Перамогі, новы ракурс для погляду на гэтыя падзеі, у тым ліку такія, якія былі б цікавыя маладому пакаленню. У межах праекта плануюцца выстаўкі, прысвечаныя пяці гістарычным перыядам — 1812 году, Першай сусветнай вайне 1914—1918 гадоў, Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў і міжваенным перыяды. Ігар Бузоўскі адзначыў, што магчыма і пашырэнне праекта, калі першыя выстаўкі пройдуць удала.

Першая выстаўка праекта адкрываецца ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа. Тут будуць прадстаўлены літаграфіі нямецкага мастака-баталіста Фабэра дзю Фора і літаграфіі па работах Васіля Верашчагіна. Гэтыя сюжэты паказваюць падзеі 1812 года, шлях Напалеона да Масквы і ўцёкі яго арміі праз Бярэзіну.

Іншыя выстаўкі плануецца ладзіць на пляцоўках беларускіх музеяў і бібліятэк. Напярэдадні святкавання 75-годдзя Вялікай Перамогі ўсе выстаўкі будуць аб'яднаны ў адну вялікую экспазіцыю ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, якую дапоўняць экспанаты замежных калекцыянераў і пісьменнікаў. Па словах Уладзіміра Ліхадзедава, свой удзел ужо пацвердзілі 50 аўтараў. Фінальная выстаўка праекта збярэ 2 тыс. экспанатаў і зойме 1,5 тыс. квадратных метраў на тэрыторыі Нацыянальнай бібліятэкі. Яна адкрыецца ў пачатку мая і будзе працаваць паўгода. Да арганізатараў праекта паступае шмат прапаноў па экспанаванні яго ў іншых рэгіёнах Беларусі і за мяжой, у прыватнасці ў Расіі, Польшчы і Літве.

**Дар'я СМІРНОВА**